ры, мастацтву і грамадскім праблемам. Выдаваўся ў Варшаве ў 1859—1939 на польскай мове. Апублікаваў шмат гістарычна-краязнаўчых, фалькл.-этнаграфічных і навукова-біяграфічных нарысаў па Беларусі. Змясціў некалькі значных публікацый М.Каліноўскага. Праца «Аб паэтычных уяўленнях літоўска-крывіцкага народа ў яго песнях» (1867, т. 16) прысвечана паўночна-заходняй частцы Беларусі (паўднёвай Віленшчыне і паўночнай Міншчыне), у якой значнае месца адведзена любоўным, сямейна-бытавым песням; этнаграфічны нарыс «Уражанні з падарожжа» (1867, т. 15) прысвечаны даследаванню Піншчыны, яе прыроды, побыту насельніцтва, дадзена характарыстыка мясцовым жыхарам, іх якасцям і рысам характару, адзення, песень; у працы «Колькі слоў аб звычаях народа ў Мінскай губерні» (1867, т. 16) даследаваны вясельныя абрады, побыт, адзенне і норавы Міншчыны. Надрукаваў шэраг публікацый Ф.Сурына, у т.л. «Колькі слоў аб творах фантазіі народа на Беларусі» (1873, т. 11) пра прыказкі, прымаўкі і песні карэнных жыхароў усходняй Беларусі; «Лісты з Беларусі» (1872, т. 10—11) пра гістарычнае мінулае, побыт і традыцыйную культуру пэўных вёсак, мястэчак і гарадоў усходняга рэгіёна этнічнай тэрыторыі Беларусі; «Лісты з падарожжа па краі» (1873, т. 12; 1874, т. 13; 1876, т. 2; 1877, т. 4; 1878, т. 6) пра гісторыю, жыццё, побыт, культуру розных слаёў тагачаснага грамадства паўночнай і паўночна-заходняй частак Беларусі. Вясельныя звычаі і песні Міншчыны адлюстраваны ў артыкуле «Яшчэ колькі слоў аб звычаях і песнях народа Мінскай губерні» (1869, т. 4) невядомай даследчыцы (пад псеўданімам Wacława). Апублікаваў апавяданне «Успаміны з Пінскага павета» Э.Ажэшка (1867, т. 15), у якім адлюстраваны мова і песенная творчасць беларусаў Піншчыны, іх характар, тэмперамент, адзенне; этнаграфічны нарыс «Дзяды» на Літве» Г.Віньчы (1904, т. 44) пра памінальны абрад Дзяды ў паўночнай Беларусі.

*Літ.*: K m i e c i k Z. Wydawnictwa periodyczne w Królestwie Polskim w latach 1868 — 1904 // Rocznik Historii Czasopiśmiennictwa Polskiego. 1965. T. 4; Я г о ж. Prasa warszawska w okresie pozytywizmu 1864 — 1885. Warszawa, 1971; Я г о ж. «Tygodnik ilustrowany» w latach 1908 — 1915 // Przegląd Humanistyczny. 1978. № 1.

*А. Ф. Літвіновіч.*

**ТЫДЗЕНЬ**, універсальная адзінка часу ў структуры традыцыйнага календара беларусаў. З цягам часу сямідзённы Т. страціў свой асноўны сэнс — суаднесенасць з фазамі Месяца, і стаў звычайнай, самастойнай адзінкай вымярэння часу. Сучасны Т. пачаў суадносіцца з годам, на працягу якога можна налічыць 52 поўныя Т. і яшчэ некалькі дзён. Перыяд, калі 1 студзеня зноў выпадзе на панядзелак, доўжыцца 28 год. У структуры бел. традыцыйнага календара хранонім «тыдзень» атрымаў даволі значнае пашырэнне і з'яўляецца адным з самых важных структурафарміравальных кампанентаў, прычым часцей за ўсё назва Т. звязана з тым днём, ад якога пачынаўся новы адлік (прамежак) часу: святкаванне Каляд доўжылася два Т. — з 7 па 19 студзеня; дзесяцітыднёвы перыяд рыхтаваў да святкавання Вялікадня, прычым амаль кожны Т. гэтага перыяду набыў уласнае імя (Усеядны, «Рабая нядзеля», Масленіца, Хрышчаты, Пахавальны, Вербны, Страсны). Святочным стаў і дзесяцітыднёвы перыяд пасля святкавання Вялікадня: 1-ы Т. пасля «Святой нядзелі» — Велікодны, Сплашны, або Святы, 2-і — Фамін, або Праводны, 7-ы — Траецкі, увабраў у сябе святкаванне Сёмухі, якая таксама доўжыцца Т., 8-ы паслявелікодны — Русальны, Граны, Клячальны. Праваслаўная царква адлічвае пасты або іх пачатак таксама Т.: сямітыднёвы Велікодны пост, Пятроўскі пост — другі Т. пасля Тройцы. Акрамя гэтага, на працягу года вызначалі яшчэ некалькі святочных Т.: Благавесны, на які выпадала святкаванне Дабравешчання (7 красавіка), Мікольскі — перад веснавым Міколам (22 мая), 7-ы і 8-ы Т. перад Ільёю (2 жніўня), Чарвівая «нядзеля» — Т. перад Успеннем Багародзіцы (28 жніўня), «Бабіна лета» (звычайна ў апошнія дні верасня ці пачатку кастрычніка), Жалезны — першы Т. кастрычніка.

*Літ.*: К л и м и ш и н И.А. Календарь и хронология. М., 1985; Л о з к а А.Ю. Беларускі народны каляндар. Мн., 1993; К р у к Я., К о т о в и ч О. Колесо времени: традиции и современность. Мн., 2003. С. 72—98; Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі. Мн., 2003; К р у к Я. Сімволіка беларускай народнай культуры. Мн., 2001.

*А. В. Катовіч.*

**ТЫПАЛАГІЧНАЕ ВЫВУЧЭННЕ ФАЛЬКЛОРУ**, навуковы метад, заснаваны на вылучэнні і абагульненні істотных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ